**КАЛОДЗЕЦКАЯ** – вёска ў Забычанскім сельскім Савеце (да 1997 г.), за 23км на Захад ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 182 км ад Магілёва, на р. Дзяражня (прыток р. Бесядзь) і аўтадарозе Краснаполле – Хоцімск.

Археалагічны помнік - курганны могільнік, які размешчаны за 1,5 км на ўсход ад вёскі, сведчыць, што гэтая мясцовасць была заселена ў глыбокай старажытнасці. Вёска вядома з 18 ст. У 1777 г. згадваецца як в. Калодзеск, у Чэрыкаўскім павеце. У 1779 г. 32 двары, 199 жыхароў, дзяржаўная ўласнасць у Крычаўскім старостве Клімавіцкага павета. Па рэвізскіх матэрыялах 1850 г. – 465 жыхароў, уладанне памешчыка А.І. Камара. У 1886 г. вёска, былое прыватнае ўладанне, 93 двары, 582 жыхары, у Брацькавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся вадзяны млын, заезны дом, хлебазапасны магазін. Вёска адносілася да праваслаўнага Брацькавіцкага прыхода Пакроўскай царквы. У 1897 г. – 150 двароў, 973 жыхары, дзейнічалі школа граматы, піцейны дом, крама. У 1909 г. – 159 двароў, 1234 жыхары, якія валодалі 1101 дзес. зямлі.

У пачатку 1920-х г. на базе дарэвалюцыйнай школы была створана 4-х гадовая школа, у якой у 1925 г. навучаліся 120 вучняў. З 20.08.1924 г. вёска ў Брацькавіцкім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Па перапісе 1926 г. у в. Калодзецкая-1 55 двароў, 297 жыхароў, у в. Калодзецкая-2 194 двары, 1100 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас “Пяцігодка ў 4 гады”.  Працавала кузня.



У Вялікую Айчынную вайну 100 землякоў загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе, у памяць аб іх у 1967 г. у цэнтры вёскі пастаўлена стэла.

Паводле перапісу 1959 г. – 648, у 1970 г. – 214 жыхароў. У 1986 г. – 163 гаспадаркі, 374 жыхары, у складзе саўгаса “Брацкі”, працавалі пачатковая школа, бібліятэка, клуб, магазін. Планіровачна складаецца з дзвюх прамалінейных, паралельных паміж сабой вуліц, падзеленых ручаём. Забудавана двухбакова, шчыльна драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Радзіма Мікалая Уладзіміравіча Леўчанкі, пісьменніка, выдатніка друку Рэспублікі Беларусь, заслужанага журналіста Беларускага Саюза журналістаў. Радзіма Віктара Уладзіміравіча Патапенкі, пісьменніка-земляка.



**М.У. Леўчанка**



**В.У. Патапенка**

У 1997 г. у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС жыхары адселены ў п. Шарэйкі.